

ЮНАЦКІ СЬПЕЎНІК





LS



МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНИМІ РАДАМІ

(Беларускі народны гімн)

словы М. Краўцова **муз. У. Тэраўскага**



1. Мы выйдзем шчыльны-мі ра-да - мі на вольны родны



свой пра-стор, хай во - ля веч-на будзе з на-мі, а



гвал-ту мы да - мо ад - пор, да мо ад-пор. 2. Ня-



хай жы-ве ма - гут-ны, сьмелы наш бе - ла-ру-скі род-ны




дух, родны дух, штандар наш бел - чыр - во-на - белы па-



крый са - бой на-род-ны рух. 4. Бра-ты, да шчасьця мы пад-



хо - дзім, хай гром грыміць я - шчэ мац - ней, у кры-



ва - вых му-ках мы на-род - зім жыцьцё Бацькоўшчыны сва-



ей, жыць-пё Баць - коў-шчы-ны сва ей.

3. На бой за шчасьце і за волю
Народу слаўпага свайго.
Браты, цярпелі мы даволі —
На бой усе да аднаго!

ЛЮБЛЮ НАШ КРАЙ

Andante; Памалу

словы К. Буйлы



1. Люб-лю наш край ста - рон - ку гэ - ту, дзе я ра-




дзі - ла - ся, рас - ла, дзе пер - шы раз паз-



на - ла шчась-це, сьля - зу ня - до - лі пра - лі ла.

2. Люблю народ наш беларускі,
І хаты у зелені садоў
Золочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў.

3. Люблю раку, што свае воды
Імчыць ў няведамую даль,
І жоўтасьць берагоў пяшчаных,
І яснасьць чыстых яе хваль.



4. Люблю вясну, што у краскі, у зелень
Прыстроіць цэлую зямлю,
На гнёздах буслаў клекатаньне
І сьпеў жаўроначка люблю.

5. Люблю гарачу сьпёку лета
І буру летнюю а дажджом.
Як гром грыміць, а у чорных хмарах
Малапка зіхаціць агнём.

6. І восень сумную люблю я,
І першы звон сярпоў і кос.
Як выйдуць жнеі збожжа жаці.
А касьбіты — на сенакос.

7. Люблю зіму з яе марозам,
Што вокны прыбярэ ў вузор.
І белы сьнег, што ўсё пакрыўшы.
Ірдзіцца блескам ясных зор.


8. Люблю у пагодную я ночку
Дапозна на дварэ сядзець,
Сачыць за зорачак дрыжэньнем
На месяц залаты глядзець.

9. Люблю, як сонейка заходзіць
І берег хмаркі залаціць,
Вячорнаго як голас звону,
К нам з ветру хваляю ляціця.



10. І песьню родную люблю я.
Што дзеькі ў полі зачяюць,
А тоны голасна над нівай
Пераліваюцца-плывуць.

11. Усё у краю тым сэрцу міла,
Бо я люблю край родны мой,
Дзе з шчасьцем першым я спазналась
І з гора першаю сьлязой.



БЕЛАРУСЬ НАША МАЦІ-КРАІНА

Мерна і урачыста

Слова Н. Арсеньневай

Moderato-maestoso


муз. М. Шуаглова

1. Бе - ла русь на ша Ма - ці Кра - і - - -
на, ты з нас моц ных зра бі ла лю - дзей. Не за-
гі - ну лі мы і ня згі - - нем, па-куль ты нас на-
пе - рад вя - дзеш. Не за - гі - ну - лі мы і ня
згі - - нем, пакуль ты нас на-пе-рад вя - дзеш.

2. Пастаім за Цябе як асілкі,
Нашы сэрцы пылаюць агнём,
Дружна, моцна за дёс Твой расьцьвілы
Супроць Чорнае Моцы мы ідзём!

3. Не шкада нам жыцьця маладога,
Не шкада нам гарачай крыві,
Абы толькі праменнай дарогай
Крочыў горда народ наш жывы.

4. Прысягаем Табе мы сягоньня,
Што пакуль хоць адзін з нас жыве, —
Нашай слаўнай Крывіцкай Пагоні
Мы ня зганьбім, мы уславім яе!



ПАГОНЯ

Словы М. Багдановіча

Allegretto. Рухава. Адзін — муз. М. Шчаглова



1. Толь - кі ў сэр-цы тры-вож-ным па - чу - ю за кра-



і - ну ра - дзі - му - ю жах; успомню Во - стру - ю



Бра - му Сьвя - ту - ю і ва - я - каў - на



ґроз-ных ка-нях. 2. У бе-лай пе - не пра но - сяц - ца



ко - ні, рвуц - ца, - імкнуц-ца і цяж - ка хры-



пяць; ста-ра - даў - най кры - віц - кай па - го - -





3. У бязьмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню сьпяшыце?
Дзе шляхі вашы ідуць і куды?

4. Мо' яны, Беларусь, панясьліся
За Тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі Цябе, адракліся.
Прадалі і аддалі у палон?

5. Б'еце у сэрцы іх, — б'еце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пнчуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць . . .

6. Маці родная, Маці-Краіна,
Ня усьцішыцца гэтакі боль! . . .
Ты прабач, Ты прыймі свайго сына,
За Цябе яму умерці дазволь.

7. Усе лятуць і лятуць тыя коні.
Срэбнай збруяй далека грымяць . . .
Старадайнай Крывіцкай Пагоні
Ні разьбіць, ні спыніць, ні стрымаць!

БЕЛАРУСКАЯ ЗЯМЛІЦА

Словы А. Пшчалкі

Andante. Павольна   муз. М. Маўісона








2. Гэта мова і край родны
Над усё мне мілы
Не магу іх адчурацца
Да самай магілы.

3. Не магу іх адчурацца
Як рукі, як вока.
Няхай слава Беларусі
Плыве у сьвет шырокі.



МЫ-МОЛАДЗЬ

Слова Араньявай

Tempo di marcia **муз. Шчаглова**



1. Мы праў-да, мы сі - ла, мы радасьць, мы рух! Вы-



цяг - ва - ем кры - лы мы у сон - ца у за - ру. Мы



імкнем-ся на уз - выш-шы, нам ме - жаў ня - ма, зда-



ец - ца нам прышласьць пра - мен - най, як май. Мы



імкнем-ся на уз - выш-шы. нам ме - жаў ня - ма, зла-



ец - ца нам прышласьць пра - мен - най, як май.

2. Мы — шчырасьць, сваволя,
Мы — песьня, мы — сьмех,
Вітае нас доля
Мільлёнам уцех.
Бядзе, гураганам
Сьмяёмся мы у твар.
Нам сполахі граюць,
Нам зоры гарань.

3. Ніхто нас ня спыніць
У лёце да зор.
Мы імпат няўпынны,
Мы — моц, мы — віхор
Мы вышлі з народу,
З крывіцкай сям'і.
У кожнай нагодзе
З ім побач стаім.

4. Мы з краем каханым
Расьцём у гару.
Мы сьвежасьць,
Мы — раньне,
Мы — радасьць,
Мы — рух.
Мы — імкнём на узвышшы.
Нам межаў няма.
Здаецца нам прышласьць.
Праменнай, як май.

ПОЙДЗЕМ, ПОЙДЗЕМ

вайсковая паходная

Словы Н. Арсеньневай

муз. М. Шчаглова

Allegro. Туіка











2. Пазьмаятаем варожую сілу
Мы з лагоў і з далінаў сівых.
Прад няўдачай цяжарам ня сьхінем,
: Ня угнём мы нідзе галады. :

3. Дый наперад адважна і сьмела,
Бараніць нашых сёлаў спакой
Хай вятры нам насустрач мяцеляць,
: Родны край-мы заўсёды з табой! :

МАРШ АРЛЯНЯТАЎ

Словы М. Кавыля

Tempo di marcia

муз. М. Шчаглова

1. Мы Бе - ла - ру - сі воль-най ар - ля-ня - ты і-мкнём-ся ў высь, у со - неч - ны прась-цяг, дзе, як а - рол, ма - гут - ны і кры-ла - ты,— шу - га - е бел - чыр - во на бе - лы сьцяг. дзе як а - рол, ма - гут ны і кры-ла - ты,— шу - га - е бел чыр во - на бе - лы сьцяг, не спа - чы сьцяг.

1. 2. 3. 4.

2. Не сначываць, узьвіўшыся да зораў.
Не у залатым раскошвацца жвіру.
Мы хочам, усе ня ведаючы гора.
Ісьш на бой за Маці-Беларусь.

3. Ня час нам сёньня плакаць, сумнявацца,
Ня нам сьлязьлівіць сьветлы, новы дзень.
Мы любім пець, мы любім пасьмяяцца
Ніколі мы ня зрадзім ў барацьбе.

КІНЬ ВЕЧНЫ ПЛАЧ

Словы М. Багдановіча

муз. М. Шчаглова

Moderato

1. Кінь веч ны плач свой аб ста-

няў-жо-жа цём-най ноч-чу

рон-цы, няў-жо-жа цём - - - най ноч-чу

ня ба-чыш, што ———— гля-дзіц-ца

ты, — ня ба-чыш, што гля-дзіц-ца

сон-ца,, у люстэрка ме-сяц за-ла-ты.— ня ба-чыш

што ————

ня ба-чыш што гля-дзіц-ца сон-ца у люстэрка

1. 2. 3.

ме-сяц за-ла-ты ён. як зо-рак сны.

2. Не згасла сонца, сонца гляне,
Усіх падыме ада сна.
: Ён гэты дзень яшчэ настане,
І ачунее старана. :

3. Я пад яе зімовай маскай,
Пад сьнегам бачу твар вясны,
: І вее верш мой дзіўнай казкай,
І ясны ён, як зорак сны.



У ГУШЧАРАХ

вайсковая паходная песьня

Словы Н. Арсеньневай

Tempo di marcia. паходна

муз. М. Шчаглова







кожны дзень, кожны час,










скаль, баль - ша вік і ня ля - хі, а - ле



ты нас вя - дзеш да за - ры. — 3. Хма - рай



дым над га - ло - ва - мі та - е, ве - цер



ды - ха - е мя - тай, быль - лём, Бе - ла-

за Ця-



русь, Бе - ла - русь за - ла - та - я.

бе мы і - дзем



за мы і - дзём, мы і - дзём. дзём. —



НАША МЭТА

Словы Н. Арсеньневай

муз. М. Шчаглова

Tempo di marcia



1. На - ша мэ - та шчась - це для лю - дзей ка-



ваць. бу - ду - чы - ню прась - - ці, зельле крыў-даў




рваць. Ва - бяць нас уз - выш-шы, цяг-не нас пра-



стор, — мы — ім кнём у выш - шу,




мы ім - кнём да зор. Эх! Мы ім - кнём у



выш шу, мы ім кнём да зор. —

2. Надыйшоў час гортам
І адвагі кон.
Мы стаім на варце
Новых, ясных дзён
За краіну-Маці
Мы агнём гарым.
: Ей і наша праца,
Ей і наш уздым. :



ДА МОЛАДЗІ

Слова В. Э. Н.

муз. Туранкова



1. Пой-дзем, брат-ка, да на-ву-кі, Пойдзем ве-ду



зда-бы-ваць. Не ся-дзі, зла-жыў-шы ру-кі,



пра-цай трэ-ба до-лю ўзяць. Не ся-дзі, зла-



жыў-шы ру-кі. пра-цай трэ-ба до-лю узяць.



Пойдзем, братка, да на-ву-кі, Пойдзем ве-ду зда-бы-вацъ.

2. Траба шмат нам усім вучыцца,
Каб айчыне лепш служыць.
З цемнатой, з галотай біцца,
Долю сьветлую здабыць.

3. У школу усе мы разам пойдзем,
Веду там сабе знайдзём.
А калі да веды дойдзем,
Тады шчасьце асягнём.
Пойдзем, братка, да навукі,
Пойдзем веду здабывацъ.




БЕЛАРУСЬ ПЕРАДУСІМ

Moderato
Урачыста, сярэдняя скорасьць

Словы і музыка А. Стэповіча



1. { Бе - ла - русь, хай сло - ва гэ - та, бу - дзіць но - вы
   { Нам даб - ро я - е во мэ - та і най - вып - шы



дух між нас. } 2. Ні сьля - за, а - ні стаг - нань - не,
нам па каз. }




ні, па ко ра а - ні страх, толь - кі пра - ца



і зма - гань - не, гэ та наш да мэ - ты шлях.

3. Беларусі сын ніколі
Не зрачэцца сваіх праў
Знойдзе дужасьці давол
Каб нявольнікам ня ста

4. Дык ці у шчасьця дзен
Ці у буры дні благім
Знайма першы кліч нар
Беларусь перадусім.



ЗАСТОЛЬНАЯ ПЕСЬНЯ


З опэры „Усяслаў Чарадзей"

Словы Н. Арсеньневай

Moderato et maestoso. Мерна і урачыста. муз. М. Шчаглова














2. Гэй, падымем у гору
Разам з чарамі струны,
Хай усьненяцца пенныя
Залацістым віном.
Хай ніколі ня зьвянуць
Прад варожаю моцай,
Хай віхураю стогнуць
Палымнеюць агнём.

3. Мы уступім на раньні
У залатыя страменьні,
Мы рэкі расгромім
Лесам вёслаў і дзід.
Скрышым сцены цьвярдыняў
І чырвоную брагу
Вып'ем прагна і додна
Усе як адзін.

4. Гэй, на бой, гэй у ном
Сэрцы ў гору падымем,
Хай усьпеняцца пенным
Залацістым віном.
Хай ніколі ня зьвянуць
Прад варожаю моцай,
Хай віхрацъ віхурай,
Палымнеюць агнём!




СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

Словы М. Багдановіча

Moderato. Памерна   муз. М. Шчаглова









2. І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўши сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персыдзкі ткуць яны.

3. А за сьцяной сьмяецца поле,
Зіяе неба з-за вакна,
І думкі мкнуцца мімаволі,
Туды, дзе расьцьвіла вясна.

4. Дзе блішча збожжа у яснай далі,
Сінеюць міла васількі.
Халодным срэбрам зьзяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі.

5. Цямнее край зубчаты бору
І тчэ, забыўшыся рука
Заміж персыдзкага узору
Цьвяток радзімы васілька.



КУПАЛІНКА

Andante. Павольна муз. Тэрсўалага




1. Ку-па-лін-ка, ку-па-лін-ка цём - на - я ноч-ка,



цём - на - я ноч - - ка, дзе тва-я доч-ка.

2. Мая дочка у садочку ружу, ружу полець
Ружу поліць, ружу поліць, белы ручкі коліць.


3. Кветачкі рвець, кветачкі рвець, вяночкі уець,
Наце, наце вам, дзяучаткі, усім па вяночку.



А МЫ ЛЯДА КАПАЛІ

веснавая карагодная-гульнівая

Allegro. (Борзда) апрацоўка М. Шчаглова













3. А мы коні выпусьцім, выпусьцім,
Зялёна наша дуброва, дуброва.

4. А за коні сто куноў, сто куноў,
Зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.

5. Мы ня хочам сто куноў, сто куноў,
Зялёна наша дуброва, дуброва.

6. Мы дамо вам дзеваньку, дзеваньку,
Зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.

ЧАЧОТАЧКА

на 2 галасы

Vivo. **Жвава** Нар. мэл. збор. **Равенскага**













2. Спарадзіўшы і ўзрасьціўшы, замуж аддала,
Бадай наша Чачотачка здарова была.
Аўгіньню за Мірона,
А Аксіньню за Сапрона,
А Тацюху за Сьпірыда,
А Насьцюху за Сьпірыда,
Радзівону — Макрыну,
А Хрытону — Грыпіну,
Хімку — за Кузьму.

3. Як пачала Чачотачка пасагі даваць,
Як пачала невялічка усіх надараць:
Аўгіньні — паясок,
А Аксіньні — кажушок,
А Тацюсе — панчошачкі,
А Насьцюсе — суконачкі,
А Грыпіне — чаравічкі,
А Макрыне — рукавічкі,
Хімцы — істужкі.

4. Зазывала Чачотачка дзесяцёх мудрых,
Зазывала Чачотачка брацікаў усіх:
Адзін быў Савацей,
Другі быў Цыньцялей,
Трэці быў Атрахім,
А чацьверты Гарасім,
Быў Барыс і Дзяніс
І дудар-удалец,
Ды слуга Карпец.

БУЛЬБА

На 2 галасы.

Народная жартоўная скочная песьня апр. А. Туранкова

Allegro. **Хутка.**



1. Гар - ні. гар - ні. буль - бу з пе - чы.



У тор - бач - ку ды за пле - чы, Буль-бу пя - куць,



буль-бу ва - рацць, буль-бу я - дуць, буль-бу хва - ляць.



Грам, там, там, та - ра - рам, там, там, Бульбу я - дуць,



буль - бу хва - ляць. трам там пі - рам та - ра - рам.

2. З бульбы мука, з бульбы каша
Прападзі ты, доля наша,
Адзін лапаць, другі бот,
А я шляхціч, далі Бог.
Прыпеў:

3. Ай туры, ды растуры,
Я шляхэцкай сам натуры,
Што суботу ем бліны,
А ў нядзелю та ўюны.
Прыпеў:



ЛЯВОНІХА

на 2 галасы

Vivo. **Жвава** **Нар. мэл. збор. Равенскага**









2. А Лявоніха ня жонка была,
Ня мытую мне кашульку дала,
Ня мыюут, не качаную,
У суседа пазычаную.

3. Як я молада ў матульні была
Як вішанька у садочку цьвіла:
Цьвіла, цьвіла ды пацьвітывала,
З малайцамі ды пагулівала.

4. Ой, згубіла мяне мамачка мая,
Што за цябе мяне замуж аддала.
Ой, чаму цябе прярун не забіў,
Як ты мяне маладзеньку любіў.

